*Новак В.С.*

**ЖЫЛЛЁ Ў МІФАЛАГІЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ**

Гомельскі ўніверсітэт імя Ф.Скарыны

(Паступіў у рэдакцыю )

Вядома, што хата для беларуса заўсёды мела сімвалічнае сакральнае значэнне, таму невыпадкова ў старадаўнія часы чалавек надаваў магічны сэнс выбару месца і матэрыялу для будаўніцтва хаты, а таксама ўсім аб’ектам рэчыўнага свету, якія мелі пэўнае сімвалічнае значэнне. Шматлікія магічныя народныя вераванні былі звязаны з першапачатковым этапам будаўніцтва хаты.

Паводле матэрыялаў, запісаных на тэрыторыі Беларусі, вялікую ўвагу надавалі нашы продкі выбару часу для будаўніцтва хаты, бо, па народных уяўленнях, людзі верылі, што ёсць “шчаслівыя і нешчаслівыя дні”. Напрыклад, “месца для будаўніцтва хаты выбіралі ў чацверг, таго што, па людскім здагадкам, ён лічыўся самым прыемлівым для пастройкі”, “самым харошым днём для пераезду лічылі Сямёнаў дзень – 14 верасня” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Загорцавай Еўдакіі, 1941 г.н.). Выбар месца для будаўніцтва хаты, зыходзячы з народных ўяўленняў, залежаў не толькі ад пэўнага дня тыдня, але і ад іншых фактараў (накірунку сонца, месца, дзе “меней за ўсё хадзілі людзі”): “Месца выбіралі па накірунку сонца: дзе ярчэй свяціла, там і строілі” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Кебікавай Ніны, 1926 г.н.); “Строіць дом лучшэ там, дзе меней за ўсё хадзілі людзі, бо лічылі гэта дурной прыкметай. Еслі пастроіць там, дзе шмат ходзяць людзі, то ў доме будуць адны няшчасці” (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Маславай Еўдакіі, 1948 г.н.). “Як сведчаць этнаграфічныя матэрыялы XIX ст., на Беларусі існавала шмат спосабаў, магічных прыёмаў выбару месца пабудовы. Так, аблюбаваўшы нейкую мясціну, ставілі на тым месцы чыгунок з павуком; калі за ноч ён пачынаў “ткаць кросны”, то, лічылася, што месца пад хату добрае. Шырока бытавала і такое павер’е: калі ў пасудзіне з мёдам, пакінутай нанач у невялікай выкапанай ямцы на абраным месцы, пад раніцу, з’яўляліся мурашкі, гэта месца лічылася цалкам удалым” [1, с. 331].

Іншы раз пры выбары месца для будаўніцтва хаты кіраваліся народнымі вераваннямі, аснову якіх складалі пэўныя бінарныя апазіцыі, напрыклад, “верх – ніз”, пры гэтым, з нізкім месцам звязвалі ўяўленні пра нячыстую сілу: “Место мы выбіралі на пагорцы, вышэй коб было, бо ўнізе нячыстая сіла водзілася. Ды і коб туманы абміналі, бо і з імі нечысць усякая цянулася” (запісана ў в. Купаўцы Лунінецкага р-на Брэсцкай вобласці). Паводле сведчанняў жыхароў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна, старажылы вызначалі па фізічнаму стану самой зямлі (цёплая – халодная), дзе лепш будаваць хату: “Старэйшыя ішлі наранні або вечарам, каму як было зручней. Старэйшыя глядзелі на зямлю: калі паласа на зямлі шла цёплая, то хата будзе цёплай, калі паласа была халоднай, то хата будзе халодная”(запісана ад Яськова Аляксея Аляксеевіча). У в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна зафіксаваны падобныя звесткі: “Яшчэ рана ўтрам жыхары выходзілі і выбіралі сабе месца, дзе зямля была цёплай, там і ставілі хату” (запісана ад Тарасевіч Веры Адамаўны). У гэтай жа мясцовасці выбар месца для будаўніцтва хаты ставілі ў адпаведнасць з механічнымі дзеяннямі ў адносінах да цаглін, якія, згодна з мясцовай традыцыяй, трэба было пакласці на папярэдне абранае месца: “Яшчэ на месца, якое выбралі, лажылі чатыры кірпіча. Калі за ноч гэтыя кірпічыны не варухнуліся, то там і ставілі, калі варухнуліся, то не ставілі, бо баяліся, што там жыццё будзе нядобрым” (запісана ад Тарасевіч Веры Адамаўны). Падобных вераванняў прытрымліваліся і жыхары Светлагорскага раёна: “Клалі чатыры кірпіча па перыметру дома. Раніцай прыходзілі глядзець на гэта месца: калі хоць адзін кірпіч ляжаў не так, як палажылі звечара – гэта азначала, што будаваць хату тут нельга” (запісана ў г. Светлагорск ад Мацкевіч Ганны Фролаўны, раней пражывала ў в. Стужкі). У гэтай мясцовасці на выбраным месцы пакідалі збан з павуком: “Калі за ноч ён сплятаў павуціну, то тут можна было будаваць хату” (запісана ў г. Светлагорск ад Паршнёвай Марыі Сяргееўны).

У адным са спосабаў выбару ўдалага месца для будаўніцтва хаты выкарыстоўвалі хлеб, які пакідалі там, дзе ўжо быў узведзены ніжні вянок

зруба, і назіралі раніцай, ці застанецца ён на тым месцы, дзе быў пакладзены: “Селянін, паклаўшы ніжні вянец, пакідаў на ноч кавалачак хлеба: калі хлеб да раніцы знікаў (а було ж і такое), то тут, веруй Богу, не трэба ж было жыць, нядобрае яно” (запісана ў в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ад Дранец Марыі Васільеўны, 1927 г.н.). Паводле сведчанняў Надзеі Рыгораўны Краўчанка, 1940 г.н., з в. Крынкі Рэчыцкага раёна, у іх мясцовасці “за некалькі дзён да будаўніцтва хаты кідалі на зямлю дубовую кару, праз некалькі дзён падымалі яе і глядзелі: калі там шмат чарвякоў ці мурашак, то гэтае месца выбіралася для будаўніцтва, а калі там заводзіліся павукі, то шукалі новае месца”. Апошняя дэталь у прыведзеным магічным прыёме выбару месца для пабудовы сведчыць аб семантычнай неадназначнасці вобраза павука ў кантэксце міфалагічных уяўленняў, звязаных з жыллём. У вышэйадзначаным фрагменце традыцыйнай культуры беларусаў засведчаны толькі факт з’яўлення павукоў на абраным месцы для пабудовы, але не гаворыцца пра павуціну, якую яны “ткуць, як кросны”, што, можна меркаваць, і з’явілася падставай для таго, каб гаспадару адмовіцца ад выбранага месца для будаўніцтва хаты. “Павук – “стваральнік”, і, відаць, таму ён выступае своеасаблівым індыкатарам пры выбары месца пад новае жытло: калі на новым месцы ён за ноч сатчэ ў жбане павуцінне – месца лічылася ўдалым” [2, с. 350].

Распаўсюджаным магічным спосабам падчас выбару месца для будаўніцтва хаты з’яўлялася пакіданне на выбранай тэрыторыі міскі з мёдам: “Бралі трошкі мёду і ў місачцы ставілі на гэтом месце. Еслі мурашкі не прыходзілі, то гэто место было нядобрым” (запісана ў в. Варані Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ад Карпавец Соф’і Іванаўны, 1937 г.н.). У в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці асцерагаліся будаваць хату на тым месцы, дзе раней знаходзілася лазня, бо “гэта ўжо було месца, як прыстанак ведзьмаў”, праклятым лічылася і тое месца, на якім “адбылося забойства ці былі калісьці знойдзены чалавечыя косці” (запісана ад Дранец Марыі Васільеўны, 1927 г.н.).

Вялікае значэнне надавалася жыхарамі Гомельшчыны выбару будаўнічых матэрыялаў для пабудовы хаты. Як сведчаць экспедыцыйныя запісы, людзі здаўна надзвычай сур'ёзна адносіліся да выкарыстання тых ці іншых дрэў пры будаўніцтве хаты. Напрыклад, ніколі не бралі з гэтай мэтай "дрэў з буралому, пабітых маланкай" (запісана ў в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ад Яськова Аляксея Аляксеевіча), тых дрэў, якія "скрыпелі", бо, лічылася, што "будуць балець і сварыцца паміж сабой гаспадары", а таксама ўважліва падыходзілі да працэсу вырубкі дрэў: "Дзерэво трэба было зрэзваць у канцы апрэля, але ж не ў полнолунне. Еслі дзерэво падае на поўнач, то яго не бралі, бо будуць паміраць наследнікі" (запісана ў в. Варані Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ад Карпавец Соф'і Іванаўны,1937 г.н.). Асцерагаліся выкарыстоўваць як будаўнічы матэрыял і дрэвы, на якіх "быў нарост", бо лічылася, што "ў гаспадароў будуць нарывы на целе", "нельга будаваць хату з дрэва са знятай карой, бо будзе хварэць жывёла" (запісана ў г. Рэчыца ад Чыжык Таісіі Іванаўны, 1939 г.н., раней пражывала ў в. Рудня Удалёўская Лоеўскага раёна).

Паводле мясцовых павер'яў, "лучшым дзеравам была асіна. Яна была самым харошым дзеравам, з якім не было звязана нікакіх магічных дзеянняў. Яна сімвалізавала шчасце. Перад пастройкай дзерава нужна было асвяціць, каб злыя духі і нячысцікі не папалі ў хату" (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Маславай Ніны, 1944 г.н.). Зыходзячы з іншых мясцовых вераванняў, асіну не выкарыстоўвалі ў якасці будаўнічага матэрыялу, бо лічылі гэта дрэва "чортавым дрэвам" (запісана ў г. Рэчыца ад Чыжык Таісіі Іванаўны, 1939 г.н., раней пражывала ў в. Рудня Удалёўская Лоеўскага раёна). Паводле сведчанняў жыхароў з в. Рубель Столінскага раёна Брэсцкай вобласці, у гэтай мясцовасці таксама не выкарыстоўвалі асіну для будаўніцтва хаты, бо гэта "чортава дрэва забірала сілу чалавека" (запісана ад Дранец Марыі Васільеўны, 1927 г.н.).

У традыцыйнай культуры жыхароў Гомельшчыны добра вядомы абрад "улазіны" ("уваходзіны"), які быў звязаны з першым уваходам сям'і ў толькі

што пабудаваную хату. Паводле агульнавядомых этнаграфічных матэрыялаў, калі сям'я перасялялася, то напярэдадні запускалі ў новую хату свойскіх жывёл, а гаспадар павінен быў першым зайсці ў хату і абавязкова прынесці гаршчок з вуголлем. "Пры "ўлазінах" трэба было памазаць мёдам усе чатыры куты, каб жыццё ў хаце было салодкае. Пераход у новы дом звычайна прыстасоўваецца да мясцовай поўні. У гэты дзень рашчынялі цеста ў старым памяшканні, а пяклі хлеб ужо ў новым, прычым дзежку з цестам пераносілі ў новую пабудову, пакрыўшы яе кажухом, вывернутым футрам наверх. Таксама было прынята ўкрасці ў суседзяў качаргу і прынясці яе ў новы дом. Абавязкова заносілі перш за ўсё ікону і стол. Сустракалася і такое, што праз адчыненыя дзверы кідалі клубок нітак. Трымаючыся за нітку, члены сям'і ўваходзілі ў хату па старшынству. Замест ніткі часта выкарыстоўвалі пояс ці плеценыя аборы" [1, с. 333]. Паводле ўспамінаў жыхароў Гомельшчыны, "новае жытло абавязкова павінна ўзяць сабе ахвяру – таго, хто ўваходзіць першым. Здавён першым у хату пускалі ката, а на падворак – пеўня. А ўжо за імі з хлебам-соллю і абразамі ішлі гаспадар з гаспадыняй і дзецямі. Кошачка першай сустракае свайго гаспадара на тым свеце, а певень заўсёды быў гаспадаром на падворку – без яго і скот не вёўся, і карова не даілася. Патом нужна была перанесці полымя са старой хаты: дзеля гэтага ў гліняны посуд клалі некалькі вуглінак" (запісана ў в. Залессе Чачэрскага р-на ад Загорцавай Еўдакіі, 1941 г.н.). Калі перасяляліся ў новую хату і першым упускалі чорнага ката, то назіралі за тым, куды ён ляжа: "дзе ён лажыўся ці садзіўся, там і ставілі кравацт маладыя" (запісана ў в. Шаламы Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ад Даніленка Кацярыны Ягораўны, 1930 г.н.). Абавязкова трэба было выканаць рытуал асвячэння хаты, асабліва ўсіх яе куткоў: "Галоўная жанчына свяціла ўсе вуглы святой вадой, у руках з іконай Бож'яй Мацеры" (запісана ў в. Славань Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці ад Пятрушка Тамары Васільеўны, 1941 г.н.). Прынята было ў мясцовай традыцыі, усім , хто прыходзіў у новую хату, прыносіць і класці "нейкую капейку, каб у новым доме дзеньгі былі"(запісана ў в. Славань

Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці ад Пятрушка Тамары Васільеўны, 1941 г.н.).

Здаўна ў працэсе будаўніцтва дома было прадугледжана выкананне рытуалаў ахвярапрынашэння. “Семантыка ахвяры будаўнічай заснавана на прыпадабненні будаўніцтва дома да стварэння свету, які, згодна з касмаганічнымі паданнямі, быў узведзены з ахвяры” [2, с. 215]. Каб забяспечыць багацце і дастатак, невыпадкова ў фундамент хаты клалі прадметы і расліны, якія і ўяўлялі ахвяру, што павінна было садзейнічаць доўгаму жыццю і дабрабыту ўсіх членаў сям’і. У якасці будаўнічай ахвяры выступалі *воўна, зерне, хлеб* (“Таксама ў фундамент клалі воўну, зёрны, кавалачкі хлеба – для багацця ў хаце” – запісана ў в. Крынкі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ад Краўчанка Надзеі Рыгораўны, 1940 г.н.), *расліны, сабраныя на Купалле* (“У фундамент клалі духмяныя зёлкі, якія збіралі на свята Івана Купалы”), *грошы* (“Закладвалі ў кожны ўгал у хаце па капейцы, каб было шчасце і дабрабыт” – запісана ў в. Дземяхі Рэчыцкага раёна ад Дзенісенка Зінаіды Андрэеўны, 1934 г.н.), *хлеб, соль, мёд* (“Мы, калі будавалі сваю хату, лажылі ў фундамент кавалак хлеба, трошкі солі і трошкі мёда. Лічылася, што, калі ўсё гэта паложыш, будзе ў гэтай хаце панаваць дабро і шчасце” (запісана ў г. Светлагорск ад Паршнёвай Марыі Сяргееўны), *высушаную траву* (“Таксама закладвалі ў фундамент траву, якую раней высушылі, каб было цяплей і не хадзілі духі” – запісана ў в. Аносавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ад Тарасевіч Веры Адамаўны). Закладванне грошай (“капеек”) у фундамент хаты суправаджалася магічным славесным прыгаворам: “Грошы тобе ложу, коб дзеток моіх глядзела, нечысць не пускала, од дурного вока засцерагала, зглазу коб не довала, а грошы коб прыбоўляла” (запісана ў в. Купаўцы Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ад Баўкуновіч Сцепаніды Несцераўны, 1938 г.н.).

Па колькасці прадметных атрыбутаў і па каштоўнасці манет, закладзеных у падмурак хаты, можна было меркаваць аб сацыяльным статусе і ўзроўні дастатку жыхароў. Напрыклад, у в. Лучыцы Петрыкаўскага раёна “ў

фундамент хаты звычайна лажылі “вянцы” з дуба, камні, манеты. “Калі клалі 3 дубовыя вянкі і залатую манету, то сяляне лічыліся багатымі, калі 2 вянкі і сярэбраную манету, то сяляне лічыліся сярэдняга дастатку; калі 1 вянок і медную манету, то сяляне лічыліся беднымі” (запісана ад Яськова Аляксея Аляксеевіча). Каб не зводзілася свойская жывёла на сялянскім падвор’і, клапаціліся пра гэта загадзя: “закладвалі ў фундамент хаты навоз, каб у хаце было багата і радзіла жывёла” (запісана ў г. Рэчыцы ад Чыжык Таісіі Іванаўны, 1939 г.н., раней пражывала ў в. Рудня Удалёўская Лоеўскага раёна).

Такім чынам, хата ў старажытных уяўленнях жыхароў Гомельшчыны з’яўлялася невялікай абжытай сакральнай часткай навакольнай рэчаіснасці і адначасова выступала як паменшаная мадэль свету.

Літаратура:

1. Кухаронак, Т.І. Звычаі і абрады, звязаныя з будаўніцтвам і засяленнем хаты. // Беларусы. Сям’я. Сямейныя абрады. Т. 5. – Мн.: “Беларуская навука, 2001. – 374 с. – С. 330-337.
2. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. Слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І.Клімовіч. – 2-ое выд., дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.: іл.
3. Левкиевская, Е.Е. Жертва строительная / Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / Под общей ред. Н.И. Толстого. – Т. 2: Д – К (Крошки) – М.: Междунар. отношения, 1999. – 704 с.

* У артыкуле выкарыстаны матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі.

## РЕЗЮМЕ

В статье рассматриваются отдельные аспекты мифологии жилья белорусов: верования, связанные с выбором места для строительства дома, строительного материала, обрядом заселения.

SUMMARY

There are some individual aspects of Belarusian dwelling mythology in the arfide such as: beliefs that associa bed with the choice of location for building a house, with the choice of a building material, with a rife of occupancy.